Przesyłka opłacona gotówką 40%.

Цана асобнага нумару 15 гр.

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

№ 14 | Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Людвісарская 8—8. | Вільня, 31-га сьнежня 1933 | Выходзіць два разы ў месяц. | Год I.

Прыймо інтарэсантаў у рэдакцыі штодзень ад 9-ій да 4-ій гадзіны. | Цана падпіскі з дастаўкай поштай: у месяц—25 гр. у 3 » —70 » у ½ года—1.30 у 1 год —2.50 | Konto P.K.O. Nr. 144.511 Уласьнік конта—Інж. А. КАРПОВІЧ.

УСІХ ПРАЦОЎНЫХ ВІТАЕМ З НОВЫМ ГОДАМ!

На рубяжы гадоў.

1933 год—год існаваньня „Беларускае Газэты"—быў ува ўсіх дзяржавах, ахопленых крызісам, годам далейшага западаньня працоўных у бяздоньне галечы. На сусьветнай арэне год прынёс шмат вялікіх зьмен, быў годам асаблівай напружанасьці і яшчэ больш насіціў порахам атмасфэру міжнародных адносін.

Старыя асновы „міру", абапертыя на штыках Вэрсалю,—надламаліся. У постаці гітлерызму на гістарычную сцэну выступіў ваяўнічы нямецкі капітал, узьнімаючы сьцяг фашыстоўскага рэваншу-барацьбы, каб нанова падзяліць сьвет. Гітлер абвясьціў сябе адначасна штурмавым па зьнішчэньні *сусьветнага* „*бальшавізму*", а гэта зусім выразна азначае, што шлях напору нямецкага імпэрыялізму бяжыць на Ўсход. Імкнучыся перакроіць нанова карту Эўропы, хочучь фашыстоўскія „географы" Нямеччыны залагодзіць вэрсальскія крыўды і суседзкія нязгоды коштам Усходу.

Англія—старая валадарка старога сьвету — не жадаючы бясслаўна выходзіць з капітанскага мосьціку перад Амэрыкай і Японіяй, з ахвотаю падтрымлівае авантурніцкія пляны Гітлера, спадзяючыся ў антысавецкай завірусе завяваць для сябе ізноў пяршынство ды ўзрасьціць на крыві вызваленых народаў СССР сваю адкрасаваўшую моц.

Цьвёрдалобыя ангельскія кансэрватысты „ня маюць нічога супроць", калі Гітлер „зацікавіцца слаба заселенымі абшарамі Заходняе [Расеі" ці, інакш кажучы, калі ён *заграбе ў свае лапы Беларусь і Украіну.* Англія „ня мела нічога супроць" таксама тады, калі Японія захапіла Манчжурыю, ператвараючы яе ў пляцдарм для вайны з Саветамі. Тая самая Англія—побач з іншымі капіталістычнымі дзяржавамі — вось ужо некалькі гадоў золатам, гарматай і вінтоўкай дапамагае белым кітайскім генэралам душыць Савецкі Кітай, каб на руінах вызваленчага руху кітайскіх народных мас стварыць сваю Манчжурыю.

* * *

Долі Беларусі нельга адарваць ад усіх гэтых падзей. Цяпер сьвет у сваім развіцьці моцна злучаны ў адно цэлае і наіўны той, хто-б хацеў адмежавацца ад рэшты народаў, хаваючыся ў сваю нацыянальную скарлупу. А ў надыходзячых падзеях „сільныя сьвету" рыхтуюць нашай Беларусі немалаважную—хоць малапачэсную ролю—*ролю разьменнае манэты ў сваіх таргах.*

Памятайма аб гэтым, як памятайма таксама аб тым, што ёсьць і *беларускія* ненавісьнікі Ўсходу, якіх страшыць *поўнае* вызваленьне нашых народных мас і якія ўсялякім коштам імкнуцца *адагнаць гісторыю беларускага народу назад шляхам ліквідацыі Савецкае Беларусі і разгрому нацыянальна-вызваленчага руху тут.* Якое-б імя не насіў гэтыя ворагі вызваленьня — белхадэкі, белсанатары, хто-б не стаяў на іх чале—Станкевічы, Стэповічы, ці Луцкевічы з Дварчанінымі *), хто-б ім не дапамагаў прадаваць беларускі народ—Марцінчыкі, Кузьмічы, Лукашыкі ці тыя, хто стараецца гэтых „памоцнікаў" выгарадзіць. апраўдаць — адна ім цана і адзін прысуд: —здрада і бязьлітасная барацьба.

Каб у надыходзячых падзеях *заважыць* на сваёй уласнай долі і самым вырашыць свой лёс, народныя масы Заходняй Беларусі павінны гуртаваць і гартаваць свае сілы да цьвёрзага абліку хто вораг і хто прыяцель, ведаючы, што *ў нашым змаганьні мы не адны.*

* * *

Пры такіх складаных умовах, у такі адказны час паўстала „Беларуская Газэта", каб сказаць свайму народу праўду аб тым, што робіцца на сьвеце і ў краі, паўстала, каб раскрываць таямніцы здрады БХД, беларускай санацыі ды іх агентуры ў сярмяжных шэрагах.

Зразумелі нас народныя гушчы. Сьціснутыя рукою галечы, яны ўсё-ж т'кі прышлі з дапамогай сваёй газэце. Больш двух тысяч атрыманых нашай рэдакцыяй лістоў, усьцяж новыя платныя падпішчыкі і сталыя карэспандэнты, гуртаваньне літэратурнага маладнякa—вось як адгукнуўся наш народ на наш пачын.

Ворагі „Беларускае Газэты" распачалі яе травіць, кампрамітаваць, бэсьціць. „Бэбэкі", „санацыйна-бальшавіцкія байструкі", „здраднікі народу"—крычалі яны, каб азьвярэлым лемантам абдурыць несьвядомых, якіх становіцца ўсе менш. А ў адказ Станкевічам і Луцкевічам да нас пасылаюць лісты і грошы нават *гурткі хадэцкага „Інстытуту Гаспадаркі і Культуры" ды бібліятэкі луцкевічаўскага „ТБА"*.

„Атрымалі мы вашу газэту,—пішуць *яны* —падабалася вельмі, наша яна. „Крыніцы" і „Роднага Краю" мы ня чытаем, хоць ідуць яны да нас задарма. Дык пасылаем вам грошы і просім высылаць нам нашую „Беларускую Газэту".

Бачаць гэта, чуюць гэта нашы ворагі, а таму ў палітычным бясьсільлі пераходзяць да мэтадаў простага даносу і рашучае правакацыі. „Сталінцы", „бальшавіцкія лёкаі", „камуністыя" — цяўкаюць яны з падваротняў. І не зважаючы на гэтую зьвягу, растуць да „Беларускай Газэты" сымпатыі сялян і работнікаў, якія *самы* выступаюць у абарону свайго друкаванага слова.

* * *

Так мы завяршаем наш 1933 год і ўступаем у год новы 1934, каб далей прадаўжаць пачатую справу. Сымпатыі і падтрыманьне з боку мас — аснова нашае справы, зарука яе слушнасьці і перамогі. З непахіснай верай *у* працоўных гушчы нашага народу будзем і надалей будзіць, усьведамляць і арганізаваць, асьвятляючы шлях да лепшае будучыні.

*) Даведваемся, што ў Менску Дварчанін выкрыты, як актыўны-школьнік Савецкай Беларусі і як вядомы вораг нацыянальна-вызваленчага руху ў Зах. Беларусі.

Каты задрыжэлі.

Пад гоман бязупынна нарастаючай па ўсім сьвеце хвалі пратэсту, распачаўся ў суботу 23-га сьнежня раніцай апошні дзень гістарычнага працэсу аб „падпал" Рэйхстагу.

Сэрод поўнае цішыні старшыня абвяшчае прысуд, на аснове якога **Торглер, Дымітраў, Папоў і Танеў апраўданы.** Ван-дэр-Люббэ асуджаны на **сьмерць.**

Падсудныя камуністы прысуд прынялі спакойна, а Любба, як і заўсёды, быў цалком апатычны.

Хоць віна падсудных камуністаў ні ў якой ступені не даказана, прысуд прызнае камуністычную партыю Нямеччыны „цэнтрам, з якога разыходзіліся ніткі падпалу".

Цэлы тыдзень думалі фашыстоўскія „судзьдзі" — Гітлер і Гэрынг, бо яны, а ніхто іншы, зьяўляюцца аўтарамі куртатага прысуду, прачытанага раніцай 23 сьнежня. Пад напорам пратэсту нямецкі фашызм прымушаны быў адступіць і гэта ёсьць вялікай перамогай рабоча-сялянскага сьвету.

Мы ганарымся, што ў агульным пратэсьце ўсяго чэснага і перадавога чалавецтва гучэў таксама і **голас Заходняй Беларусі**, што беларускія сяляне гутарылі пра адважнага Дымітрава, жадаючы яму ад шчырага сэрца перамогі.

Бачаць і разумеюць народныя масы Зах. Бел. таксама той факт, што **х-дэцкая „Крыніца" злосна праваўчала нажпрам тумоны Гітлера працэс**, не сказаўшы аб гэтым працэсе ні слова, хоць ён знаходзіўся ў цэнтры ўвагі ўсяго сьвету. **Запамятаюць гэта нашыя сяляне і работнікі як простае і да найвышэйшай нагласе выслужваньне перад нямецкім фашызмам і сувязь з ім.**

Перамога ТБШ.

У нядзелю 17-га сьнежня адбыўся ў г. Беластоку акружны зьезд Таварыства Беларускае Школы. На зьезд прыехалі дэлегаты з Беласточчыны, Ваўкавышчыны і Гарадзеншчыны. Многія з іх ехалі коньмі аж з-пад Сьвіслачы. Да пачатку зьезду было дэлегатаў з рашаючым голасам да 40, а разам з госьцямі каля 100 чал.

Характэрнаю рысаю зьезду была *згуртаванасьць і самастойнасьць мясцовых тэбэшоўскіх дзеячоў*, якія сваім зьездам кіравалі самы, без „дапамогі" Марцінчыкаў і Лукашыкаў. Зьезд віталі прадстаўнікі работніцкіх арганізацый Беластоку.

Адным з галоўных пытаньняў парадку дня была справа роднае школы. Ĭ сам гэтай балючай справе гаварылі многія дэлегаты, ілюструючы жывымі прыкладамі тую крыўду, якую дзіцяці беларускага селяніна і работніка чыніць чужая школа. Вынесена *пастанова з дамаганьнем роднае школы.*

Адмоўным момантам у працы зьезду неабходна адзначыць адсутнасьць крытыкі дзеяньняў сяброў Галоўнае Управы ТБШ Шырмы і Стэцкевіча. Сам-жа старшыня гр. Стэцкевіч, хоць і быў на зьезьдзе, але аб гэтых справах не адважыўся сказаць ні слова.

Аднак, адбыты зьезд з яго масавасьцю, арганізаванасьцю і самастойнасьцю трэба лічыць яшчэ аднэй перамогай ТБШ на цярністым, але пачэсным шляху сапраўды народнае культурна-асьветнае працы ў Заходняй Беларусі.

Прысутны.

Ад рэдакцыі. Падрабязная справаздача аб зьезьдзе будзе зьмешчана ў наступным нумары нашае газэты.

Ліст у рэдакцыю.

ЗАКІДЫ СЛУШНЫЯ.

Паважаны грам. Рэдактар!

Агульны сход беластоцкага гуртка ТБШ адбыты дня 10 сьнежня 1933 г., разгледзеўшы артыкул „Тое, што сталася" ў справе ̆сяброў Галоўнае Управы ТБШ д-ра Марцінчыка і сябры ТБШ Васіля Лукашыка, якім зроблены закід школьнае працы ў Т-ве, лічыць гэты артыкул з усім справядлівым і аднагалосна дамагаецца, каб Галоўная Управа ТБШ выказала сваю думку праб наш ворган „Летапіс", як аб Марцінчыку, так і аб Лукашыку.

І выслухаўшы справаздачу з дзейнасьці гуртка за мінулы час, калі ўзяў на сябе адказнасьць за працу гуртка Лукашык. Сход рашуча сьцьвярджае, што ўся гэта праца Лукашыка давяла гуртак да поўнага занепаду і дэзарганізацыі. За гэта Лукашык і нясе адказнасьць. Сход вынес поўнае недавер'е і пастанавіў за школьную працу Лукашыка з ліку сяброў гуртка выключыць.

Старшыня Сходу (—) *Я. Грыгорчук.*
Сэкрэтар Сходу (—) *В. Зайкоўскі.*

Прысуд апраўдаў Дымітрава, Торглера, Папова і Танева, але яны і надалей знаходзяцца ў гітлероўскай турме. Нямецкі фашызм, разьюшаны ганебным правалам, нiяк не можа згадзіцца з тым, каб Торглер і баўгары вырваліся жывымі з яго кіпцюроў.

Гітлероўская прэса падрыхтоўвае грамадзкую думку, каб над падсуднымі зрабіць яшчэ адзін працэс за „здраду". Тым мацней павінен гучэць пратэст: **вызваліць падсудных Дымітрава, Торглера Папова і Танева!**

Пратэст сялян вёсак Нязбодзічы і Зарэчаны!

(Ваўкавыск). Мы, ніжэй падпісаныя сяляне в. Нязбодзічы, прачытаўшы ў № 12 „*Беларускае Газэты*" заклік 80-ці гадовае маці Дымітрава: „Вырвіце з лап нямецкага фашызму жыцьцё майго сына, прысьвечанае пралетарыяту!" — дамагаемся: **звольніць падсудных Дымітрава, Папова, Танева і Торглера!**

Мы горача пратэстуем супроць душэньня работніцкага руху ў гітлероўскай Нямеччыне, супроць подлых вычынаў азьвярэлага нямецкага фашызму! *Падпісы 35 сялян і сялянак.*

* * *

Падобны-ж пратэст прыслалі нам сяляне **в. Зарэчаны** з 10 падпісамі.

Лясныя работнікі бастуюць.

Амаль 80 процантаў польскага экспарту (вывазу) дзерава ідзе з Заходняе Беларусі. Усім ведама—справа гэтая няраз абгаварвалася нават на старонках польскае ўрадавае прэсы — што экспарт гэты адбываецца коштам бязьлітаснага вынішчэньня прыродных багацьцяў нашага краю. Але мала дзе абгаварваўся той факт, што лясны экспарт ішоў таксама коштам *жыцьця* лясных работнікаў — лесарубаў, вазакоў, тартачнікаў. Іменна коштам жыцьця, бо іх жыцьцёвы ровень —калі наагул можна назваць жыцьцёвым роўнем прыгонную ў нялюдзкіх варунках працу, бязьмежную галечу і заўсёдны стан голаду і паўголаду—сапраўды *жудасны*.

На долю гэтых лясных работнікаў праліваюць крыху сьвятла забастоўкі, якія за апошнія пару гадоў выбухаюць час ад часу то ў Гайнаўцы, то ў Белавежы ды праходзяць пры надзвычайным напружаньні, знаходзячым сваю праяву ў бурных выступленьнях бастуючых.

Сёньня ізноў наглядаем падобнае зьявішча, толькі што на гэты раз забастовачны рух разьліўся *значна шырэй*, ахапляючы Беласточчыну, Горадзеншчыну, а часткова Слонімшчыну і Берасьцейшчыну. У забастоўцы, якая пачалася ў канцы лістапада і трывае праз увесь месяц сьнежань, прымаюць удзел шматлікія вёскі, бо-ж і самыя лясныя работнікі—гэта пераважна сялянская беднатa. Карэспандэнты нашыя паведамляюць, што такі шырокі забастовачны рух выкліканы нятолькі вельмі нізкімі заробкамі, але таксама і *зямельным голадам* сялянства, аб чым можна судзіць на аснове дамаганьня *пашы ў дзяржаўных лясах*.

Даведваемся, што бастуючыя выбралі шэраг забастовачных *камітэтаў*. Нават *„Эхо Бялостоцке“* прызнае, што „значная частка“ дамаганьняў — слушная. Ясна, прызнаньне гэтае няшчырае. Затое сяляне і работнікі, якія самы жывуць у падобных абставінах, *добра разумеюць бастуючых і прыходзяць ім з дапамогай.*

* * *

Лічым гэтыя *факты жыцьця* Заходняе Беларусі вельмі паважнымі і заслугоўваючымі пільнай увагі. Таму будзем старацца аб іх як мага больш дакладна інфармаваць, хоць-бы і паводле польскае беластоцкае прэсы.

„Арыгінальныя (!?!) дамаганьні“.

(*„Эхо Бял.“ за 8 сьнежня*) „Ужо тыдзень бастуюць лясныя і дрэваапрацоўваючыя работнікі, працуючыя пры вырубе лясоў ці пры іншых лясных работах у Супрасьлі, Чарнэй Всі, Навасёлках, Шудзялове і інш. Як нам паведамляюць з верыгодных крыніц, забастоўка выбухла ў выніку ведзенай доўгі час г. зв. лявіцай клясавых прафсаюзаў агітацыі сярод работнікаў. Бастуе значная колькасьць чорнарабочых, працуючых дарыўча і пераважна землябаў па прафэсіі. Бастуючыя дамагаюцца падвышэньня платы на 30-50%. Апрача гэтага большасьць працуючых высоўвае арыгінальныя (!) дамаганьні прызнаць ім зямлю для засеваў, пашу і сенажаці. У гэтым кірунку вядзецца моцная агітацыя, знаходзячая сярод малазямельных сялян послух.

Становішча ў ахопленых забастоўкай мясцовасьцях завастраецца, ня выказваючы ніякага нахілу да паправы“.

Нічога „няжыцьцёвага“ няма.

(*„Эхо Бял.“ за 11 сьнежня*). „Мусім адразу сказаць, што пасьля атрыманьня цыфравых і падрабязных даных цэласьць справы выглядае ў крыху іншым сьвятле, чым той, у якім асьвятлялі гэтую справу ў папярэдніх артыкулах мы.

Вось-жа забастоўкай ахоплены 700 работнікаў чатырох надлясьніцтваў: Валілы, Крынкі, Саколка і Супрасьль. 90% бастуючых работнікаў—гэта малазямельныя сяляне, якія з свае працы на зямлі могуць утрымацца ледзь 4 месяцы ў год. Рэшту дарабляюць працай рук або з канём. Іншыя 10% бастуючых зьяўляюцца г. зв. на вёсцы „каморнікамі“ і зямлі ня маюць зусім, пражываючы з дарыўчае працы ці то ў іншых сялян, ці ў лесе або ў горадзе.

Заробкі лясных работнікаў у памянёных надлясьніцтвах хістаюцца ад 90 гр. да 1 зл. 10 гр. пры 12, а часта і 14-гадзінным дню працы. Зразумела, што такога „заробку“ не хапае на самае галоднае існаваньне нават пры запасах бульбы. Хоць бастуючыя дамагаюцца даволі значнага павышэньня заробкаў, характэрна, што дамаганьні гэтыя зводзяцца толькі... да выраўнаньня платы з работнікамі Белавескай Пушчы.

Гэта гаворыць само за сябе і адсоўвае аргумэнт аб напастлівасьці бастуючых і аб узмоцненай агітацыі, праявы якое хоць і былі, але не ў якой-небудзь вызываючай форме. (Выняткам зьяўляецца падпал забудаваньняа аднога з страйкаломаў). Таксама дадатковыя дамаганьні бастуючых у сапраўднасьці не зьяўляецца нечым няжыцьцёвым, бо работнікі дамагаюцца толькі прызнаньня ім пашы ў лясах на лягчэйшых варунках.

* * *

У сувязі з забастоўкай Павятовае Староства завесіла ў Навасёлках аддзел прафсаюзу лясных работнікаў. Аддзел абымае 3 надлясьніцтвы—Саколка, Крынкі і Валілы (Супрасьць мае асобны аддзел)“.

Забастоўка расьце.

(*„Эхо Бял.“ за 14 сьнежня*). „Забастоўка 700 лясных рабочых прадаўжаецца. З прычыны агітацыі да яе далучаюцца ўсё новыя работнікі. Мусім з націскам падкрэсьліць, што калі цяперашняя забастоўка лясных рабочых ня будзе як мага хутчэй зьліквідавана, тады ня хопіць матэр'ялу для працуючых дзяржаўных тартакоў“.

(*„Эхо Бял.“ за 17 сьнежня*). „Трываючая дза тыдні забастоўка лясных работнікаў завастраецца. На дарогах і шосах гарцуе банда з 30 чалавек. На чале банды нейкія Сьвятліцкі і Кальнацкі з в. Студзянкі, гм. Чорнавескай. Банда, ўзброеная ламамі, прымушае вазакоў пакідаць працу. Учора гэтая банда на 11 клм. да Супрасьля стэрарызавала некалькіх вазакоў, прымушаючы іх зваліць дзерава. Упартых зьбівалі і сілай вываpачвалі вазы. Ёсьць з гэтай прычыны значныя страты“.

* * *

(*„Роботнік“ за 28 XII*). „18 XII. і пазьней на тэрыторыі супрасьльскага надлясьніцтва арыштавана да 40 чал. бастуючых. Пасьля гэтага рэшта работнікаў пашла ў масе 500 чал. на пастарунак, дамагаючыся слоўна і пісьменна звальненьня арыштаваных“.

„Лёгіка“ п. Рагінскага.

„Эхо Бял.“ за 23 сьнежня ў артыкуле пад загалоўкам „Небясьпечная гульня з вагнём“ піша: „Вестка аб адмове дырэктара Дзяржаўных Лясоў распачаць перагаворы выклікала сярод бастуючых надзвычайнае незадаваленьне і абурэньне.

Ня гледзячы на пабожныя пажаданьні і прадбачаньні п. дыр. Рагінскага, забастоўка ня толькі не заламліваецца, але наадварот — пашыраецца з дня на дзень, становіцца што-раз грязьнейшай і можа зыйсьці на зусім небясьпечныя дарогі. У сучасны мамэнт забастоўка ахапіла амаль усіх лясных работнікаў і вазакоў акалічных надлясьніцтваў. Лічба бастуючых перасягнула цяпер 1000 чалавек.

Работнікі настроены баставаць аж да поўнае перамогі. У ваколічных вёсках зарганізавана акцыя помачы на карысьць бастуючых“.

Віленская хроніка

Выбары ў гарадзкую раду. У сярэдзіне месяца лютага маюць быць расьпісаныя выбары ў гарадзкую раду Вільні, а ў красавіку адбудуцца выбары ўжо на аснове новага выбарчага закону.

Самавольны выруб лесу. „Ілюстраванаму Кур'еру Цодзеннаму“ паведамляюць з Вільні, што ў лесе маёнтку Антанін (гміны Астраўскае) сяляне зрэзалі каля 100 пнёў. Вырубшчыкаў лесу затрымалі лясьнікі Невяроўскі і Дэмко. Сяляне кінуліся на лясьнікоў, разброілі іх і пабілі, пасьля чаго прывязалі да дрэваў „каб ваўкі пажэрлі“. Адзін з сялян зьлітаваўся над лясьнікамі, бо тады быў мароз да 20 градусаў. Селянін гэты паціхеньку адлучыўся ад грамады і адвязаў лясьнікоў. Абшарніца ў нагароду за гэта даравала яму самавольна вырубленае дрэва. 9 сялян арыштавала паліцыя.

Палітычная мэты „апалітычнага“ воргану.

Мы не павінны верыць *на слова*, бо на слова вераць толькі наіўныя. Калі «Самапомач» вуснамі хадэка Клімовіча заяўляе аб тым, што яе дзейнасьць накіраваная на карысьць *усяго* беларускага грамадзянства і пры тым «апалітычная», дык нам трэба супаставіць выказанае з штодзённай практыкай, праверыць на фактах сапраўднасьці, а тады стане відавочным, што бэхадэкі Клімовічы і Дылісы, пад кіраўніцтвам кс. Станкевіча, у сядле „апалітыкі“ вязуць сваю хадэцкую палітыку.

Зразумела, хадэкі ня могуць ня бачыць таго, што дзеецца ў працоўных гушчах Зах. Бел., прыціснутых цяжарам чатырох-гадовага крызізу і існуючых абставін. Улічваючы незадаваленьне мас, хадэкі падсоўваюць свае „парады“: „Мы пераконаны—піша „Самапомач» — што выхад з гэнага палажэньня *адзіны і няўхільны* знаходзіцца (дзе-ж вы думаеце?) у каапэратыўным ладзе гаспадарчага жыцьця“. Гэта—«найкарацейшая дарога»—кажуць хадэкі.

Каб даказаць, што гэта „найкарацейшая дарога“, Адольф Клімовіч стараецца расхваліць „дасягненьні“ каапэрацыі ў капіталістычным сьвецe, каб зусім прамаўчаць, або абліць цэбрамі бруду сапраўдны размах каапэрацыйнага будаўніцтва ў Савецкім Саюзе, дзе каапэрацыйныя формы гаспадарчага жыцьця перамаглі толькі ў выніку таго, што працоўны люд стаў гаспадаром свайга лёсу і краю.

Клімовіч захапляючыся маною гісторыі каапэрацыйнага руху ў Англіі, апавядае сваім чытачом аб „Новым Рочдэлі“, дзе „80 гадоў таму безработныя адмовіліся ад дзяржаўнае дапамогі і самі сталі для сябе тварыць дабрабыт, наводзячы *ашчаднасьці* ў сваім штодзённым бюджэце і цяпер, праз 80 гадоў, (слухайце, слухайце, працоўныя Зах. Бел. аб „карацейшай дарозе“!?) «Новы Рочдэлс» ня знае «безрабоцьця» — з салодкай усьмешкаю, поўнай маны, канчае Клімовіч апаваданьне.

Ну, а што сталася з Англіяй? — пытаецца сьціснуўшы зубы сярмяжнік-беларус. Хадэкі маўчаць, хаваюць праўду, хаваюць тое, што ў Англіі больш 3-х мільёнаў безработных, а ў Нямеччыні—краіне моцнага каапэрацыйнага руху крызіс спаралiжаваў гаспадарчае жыцьцё, адганяючы яго на дзесяткі гадоў назад.

Адкрыта ашукваючы несьвядомага чалавека, хадэкі плятуць нябыліцы пра Амэрыку, пра тое як „жыхары места Сетлі ў штаце Вашынгтон“ стварылі „Лігу безработных“ (цікава, чым гэтая „ліга безработных“ займаецца?) І кажа Клімовіч: „У ваколіцы места ёсьць многа лясоў, багатыя палі, рыбы ў моры... адразу для усіх знайшлася праца...“ Як, якім чынам? — пытаецца чалавек змучаны безрабоцьцем. Пачакайце, ня усё адразу! „Апалітык“ Клімовіч любіць адурачваць толькі папарадку.

Кажы-ж хадэк: „Дык вось гаспадары лясоў, палёў і мароў аддалі іх у карыстаньне безработных за... за невялікую плату... Жыцьцё пайшло ў Сітлі без грошай... хочаш дастаць рыбы... давай хлеб і да хлеба“.

А ўсё-ж такі, як-жа справы стаяць у гэтай самай Амэрыцы? Паважаныя нашыя чытачы, справы там стаяць зусім ня так, як аб іх пішуць хадэцкія пісакі. Там 12 мільёнаў безработных (з сем'ямі каля 35—40 міл. чал.) ня маюць сродкаў да жыцьця, а капіталісты мільёны пудоў пшаніцы і кавы кідаюць у моры, паляць паравозы, каб утрымаць высокія цэны.

Віною гэтых бед хадэцкія гора-каапэратары лічаць ня сучасны гаспадарчы ўклад жыцьця, а толькі «дзікі да апошніх дзён рынак», які можна, быццам, зьнішчыць шляхам каапэрацыі (не парушаючы капіталістычных асноў). „Наибольшы поступ у гэтым кірунку — чытаем у адным з нумароў „Самапомачы“ — зрабілі Фіны і ўсе скандынаўцы... тудою дарога і для нас беларусаў“. Разумеем, што гэта дарога *для вас* заможнікаў-хадэкаў, а не для нас, сярмяжнага люду.

Усіх тых, хто выступае супроць хадэцкае ашуканчае бязглузьдзіцы, хто хоча есьці хлеб і быць гаспадаром свайга лёсу не праз 100 гадоў а заўтра і не „шляхам“ збору зёлак, дзічак і ягад, не „шляхам“ каапэрацыйнага ківаньня пальцам у боце, а чынам і воляй працоўнага люду, —вось усіх гэтых хадэкі хрысьцяць „здраднікамі народу“, людзьмі з „нячыстымі душамі“.

Пачынаючы ад першага да апошняга нумару „Самапомачы“—Станкевічы, Клімовічы і „прысьцяжныя“ Дылісы стараюцца ажыцьцявіць наступныя мэты:

1. Упаіць у галовы несьвядомых грамадзян, быццам, насельніцтва Зах, Бел. *усё роўнае*, няма ні бедных ні багацеяў, а ёсьць толькі беларусы.

2. Даказаць, што з сучаснага стану і крызісу можна выйсьці *толькі* шляхам каапэрацыі, ашчаднасьці ды „самавыстарчальаасьці“.

3. Усімі сродкамі—замаскаванымі і яўнымі—абліваць брудам дасягненьні сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР, чарніць яго ў вачох заходнябеларускага грамадзянства, паказваючы яму за прыклад капіталістычныя дзяржавы.

Вось галоўныя пункты палітычнае мэты «Самапомачы». Гэта не схаваць Клімовічу ад шырокіх народных гушчаў салаўінымі трэлямі пра „апалітычнасьць“.

З усяго нашага агляду „Самапомачы“ нашы чытачы не павінны зрабіць вываду, што мы—ворагі каапэрацыйнага руху. Не, мы ня ворагі яго. Мы дамагаемся праз розныя формы — і праз каапэрацыю — палепшаньня жыцьцёвых умоваў жыцьця працоўных. Але мы ніколі ня будзем ашукваць грамадзянства, што шляхам каапэрацыі, ашчаднасьці і збору „насеньня дзічак“ можна выйсьці з існуючага стану і крызісу.

У нашым разуменьні каапэрацыя ёсьць формай (поруч з другімі) *гуртаваньня працоўных супроць вызыску багацеяў*, формаю нацыянальнага і сацыянальнага ўсьведамленьня народных гугушчаў, якія здабудуюць лепшае заўтра сваімі ўласнымі рукамі, без „апалітыкаў“—хадэкаў і іхных высокапалітычных апякуноў.

Баравізна.

Нашае жыцьцё.

Прывітаньне.

Паважаны грамадзянін Рэдактар
і супрацоўнікі „Белар. Газэты“!

Мы, сяляне вёскі Каралевічы, Галубічаўскае гміны, Дзісьненскага павету, чытаючы і слухаючы зьмест Вашае газэты, адчуваем падняцьце духа і нараджэньне цьвёрдых надзей на лепшую будучыню. Бо кожнае слова Вашае газэты гучыць праўдай аб нашым горкім жыцьці. Таму шчыра вітаем Вас, змагары, і заклікаем усіх працоўных Заходняе Беларусі чытаць, пашыраць і падтрымліваць нашу родную „Беларускую Газэту“!

З паважаньнем сяляне вёскі Каралевічы!

А. Рэдзька, Ліда Рэдзька, Захар Майсеёнак, Вера Рэдзька, А. Рэдзька, Агата Рэдзька, В. Дзехцяронак, І. Рэдзька, К. Рэдзька, Т. Бурэнь, К. Рэдзька, І. Рэдзька, Ю. Рэдзька, П. Груманд.

Нашыя ліквідатары.

(Вялікія Грын[illegible]кі, Ваўкавыскага павету). У суботу, 9 сьнежня, мы, [illegible] сябры гуртка ТБШ, апошні раз сабраліся ў бібліятэцы[illegible]-чытальні, пачыталі, пасьпявалі беларускіх песень, а ў канцы Управа Гуртка абвясьціла ўсім нам, што з [illegible]гэтага дня чытальня будзе нячыннаю. Прычынаю закрыцьця ёсьць, быццам, недахоп матэрыяльных сродкаў (ня было чым заплаціць за памешканьне). Управа Гуртка вінаваціць сяброў, што ня плацяць складак, а сябры вінавацілі Управу, што кепска кіруе. Некаторыя сябры катэгарычна заяўляюць, што складак плаціць ня будуць, бо Управа Гуртка выдае грошы на розныя непатрэбныя выдаткі (калі фатаграфавалі драматычную сэкцыю, Управа плаціла з касы гуртка палавіну вартасьці за кожнага сябра; кіраўнік драматычнай сэкцыі дае дармовыя білеты пасланцам з запросінамі да лясьнічага і г. д.). Кожны такі выдатак цягне за сабой такія вынікі, што няма чым заплаціць нават за памешканьне. А сродкаў павінна было-б хапаць. У нас і спэктаклі адбываюцца хоць ня вельмі часта, але заробак — моʻ невялікі — ды ёсьць кожны раз. Пры закладаньні бібліятэкі-чытальні зьбіралі мы ахвяры. На карысьць яе асыгнавала і гмінная рада 80 злотых. А ў нашай бібліятэцы за 5 гадоў існаваньня налічваецца ўсяго толькі 200 кніжак. Інструкцыя ТБШ вымагае, каб бібліятэка ўсьцяж папаўнялася новымі кніжкамі, а ў нас ідзе наадварот — і гэтых хутка ня будзе. Ці-ж ня відно тут шкодніцкай рукі? Ці-ж ня вылазіць шкодніцкае шыла з мяшка асабліва ў гэтай ліквідацыі нашай вясковай бібліятэкі-чытальні? Цяпер, зімовым часам, калі сяляне свабаднейшыя і маглі-б карыстацца кніжкай, нашы „дабрадзеі“ зачыняюць бібліятэку-чытальню. Раней-жа, падчас гарачых палявых работ, яна была чынная і грошы на памешканьне былі. Чыя-ж тут шкодніцкая рука? Хто так „кіруе“ нашымі справамі? Есьць тут у нас „парачка“ — Анатоль Сахарчук і Андрэй Трахімік. Яны гэта і вычаўпаюць такія штукі. Колькі разоў не зьмянялася Управа Гуртка, заўсёды яна была слабавольнай і фікцыйнай, бо ўсімі справамі і надалей „заварачвалі“ Сахарчук і Трахімік, *сеючы разлад, вядучы падрыўную працу і нюхаючыся з нашымі ворагамі.* Дык зьвяртаюся да ўсіх нашых сяброў і заклікаю *ачысьціць* гуртог ад здраднікаў ТБШ, ад ліквідатараў нашае культурна-асьветнае дзейнасьці. Пара браць кіраўніцтва ў *свае* рукі і *самым* кіраваць *сваім* гуртком.

І. Зоркі.

Самаволя Шараёў.

(Маёнтак Нізяны, Ваўкавыскі павет). Уласьнікамі гэтага маёнтку ёсьць браты Вячэслаў і Юрка Шараі. Аб іх прагавітасьці на працоўны пот сьведчыць тое, што парабкоў і сэзоньнікаў яны змушаюць працаваць вясной ад цямна да цямна, улетку—дзень і ноч, нядзелямі і сьвятамі, узімку — ад 4 гадз. раніцы да... пакуль вочы бачаць перад сабою коней. За такую катаргу паны плацяць парабкам 20 залатовак у месяц. Дзяўчатам-работніцам, якія ад зары да зары працуюць на тытунёвых плянтацыях, дастаецца па 11 зл. месячна. Ня лепшая доля сэзоньнікаў. Ім плацілі за дзень пры жнівах: мужчынам—1 зл., жанчынам—80 гр. Але на гэтым не канчаецца прыгонная доля шараёвых нявольнікаў. Шараі любяць катаваць парабкоў за абы што. Вось факты:

Сустрэўшы парабка Баяра Язэпа, паніч Юрка моцна зьбіў яго далонямі па твары, а калі ня служылі рукі, тоўк ботамі. Зьверска пабіты быў парабак Казёл М., Фунт А. Лысэвіча С. паны паклікалі ў пакоі, дзе—замкнуўшы на ключ дзьверы, паніч Юрка трымаў, а Вячэслаў біў колькі мог. Аднойчы паніч Юрка сьцьвічыў да паўсьмерці нагайкай Акалоціка В., які ішоў з гармонікам праз двор. Падобны лёс спаткаў Пякарскага Я. Трэба ведаць, што гэта робіцца на тракце, які вядзе праз двор Нізяны і якую гміна папраўляе шарваркамі.

Апрача гэтага паны Шараі славяцца традыцыйнымі шляхоцкімі „дажынкамі“. Былі гэтыя „дажынкі“ і сёлета. На „дажынках“ панічы пояць гарай сваіх нявольнікаў, каб спакайней стаялі пад убоем. Калі ўсё было ў самым разгары, налятае паніч Юрка і давай усіх цьвічыць найгакаю. Перабралася мера—пацякло цераз берагі: маладыя парабкі пачалі бараніцца. Паніч раздаў сваім падлізам аружжа, пастаўляў іх на „стратэгічных пунктах“ і загадаў распачаць стральбу. Парабкі адбіваліся каменьнем.

Вынік вайны такі: многа ран і гузоў, а тыя, хто не даваўся біць — Квачанюк П., Лысэвіч А., Фунт А. і Шукайла Ю.—на месяцы атрымалі разьлік з працы. Іншыя атрымалі тэрмін да 1 красавіка 1934 году. Назаўтра мімаходам у маёнтку быў паліцыянт. Ён даведаўся аб усім, але не палічыў гэтага за „zakłócenie porządku publicznego“ і нават не напісаў пратаколу.

Браты парабкі! Пара апамятацца і зʻарганізавацца, каб дружна даць адпор панскаму глуму і цьвёрда стаяць у абароне сваіх чалавечых правоў.

Адзін з рабочых.

Нашыя будні.

(в. Юшкавічы, Мядзельскае гм., Пастаўскага пав.). Ад часу ліквідаваня „Грамады“ ў нас усё заснула. Моладзь і старэйшыя вольны час аддавалі гульні ў „21“.

Але вось настаўнік польскае школы Жахоўскі заснаваў „Стшэльца“ кажучы, што тут народ цёмны і трэба пашырыць культуру. І сапраўды, вёска пабачыла «культуру»: хлапцы маршыравалі па салдацку з песьнямі, вучыліся страляць з вінтовак, калоць і г. д. Сам жа настаўнік скора ад нас выехаў недзе ў Польшчу, а «стшэльцы» вялі „культуру“ ужо без яго.

Вясною ў 1932 г. да нас прыехаў каморнік Рабіноўскі рэзаць вёску на хутары.

Для сялян, абцяжараных і без таго ўсялякімі цяжарамі, зваліўся яшчэ адзін цяжар. За рэзаньне хутароў вызначылі плату па 14 зл. з дзесяціны, з чаго 10 зл. трэба было плаціць каморніку адразу (бо ён ня быў „rządowy“, але прыватны), а рэшта па ратах што месяц. Апрача таго плацілі за дом дзе была яго кватэра і за другі дом, дзе была яго канцэлярыя, а таксама плацілі за апал і асьвятленьне гэтых амоў, ды давалі куды трэба хурманкі на разьезды. Сказаць трэба, што людзі ў Юшкевічах бедняки, маюць па 1, 2 і 3 дзесяціны зямлі, а яны хутароў не хацелі, але багацейшыя перамаглі.

Да зімы 1932 г. хутары ня скончыліся і ўсе думалі, што зімою, калі рабіць ня будузе чаго, каморнік паедзе дамоў (жыве ён каля Будслава, дзе мае свой маёнтак). Але ён ехаць нікуды ня зьбіраўся. Зімою ён працаваў „w pocie czoła“ над паглыбленьням „культуры“. Зьбіраў вясковых музыкантаў і вучыў іх граць, а хлапцоў і дзяўчат скакаць нейкія панскія танцы. З «стшэльцаў» залажыў тэатральную групу і вучыў адыгрываць прадстаўленьня.

Скрыва паглядала вёска на гэную яго работу. Зіма. Вечары доўгія. Многа ішло на апал ды асьветленьне кватэр каморніка. Але рабіць ня было чаго. Кожын баяўся адкрыць рот, каб не ўзлаваць пана каморніка. Баяліся нават сказаць што-колечы адзін—аднаму, бо былі здраднікі, якія аб усім даносілі каморніку. А каморнік жыў папанску. Ня толькі сам з жонкаю і з «кухаркаю», але нават ягоная сучка ела так, як сярэдні гаспадар у Юшкевічах еў на вялікдзень, сёмуху ды коляды. „Ратаў“, каторыя плаціла вёска, яму не хапала і ён браў у сялян у каго што папала: муку, масла, яйкі, а за ўсё, як казаў, заплаціць пасьля. Адказацца ізноў-жа ўсякі баяўся, бо ніхто не хацеў быць горшым.

Каморнік чуўся, як дома. Загадаў нават людзям вазіць дровы за 45 вёрст ад Юшкевіч аж у свой маёнтак.

Тут вернемся да ягонае працы. Калі ўсе вывучыліся адыгрываць свае ролі, было шырака апавешчана, што „Związek Strzelecki“ ў Юшкевічах, пад кіраўніцтвам „mierniczego Rabinowskiego urządza przedstawienie“. Пастаўлены быў „Porucznik I-szej Brygady“, а даход ад прадстаўленьня меўся ісьці на бедных школьных дзяцай. Але на тое ён каморнік, каб плянаваць і уплянаваў такі бюджэт, што бедным дзецям можа засталося трохі балей за „нуль“, а можа і не, затое з даходу, сабранага ад прадстаўленьня ён сабе і сваёй кумпаніі (панічы з суседніх маёнткаў, настаўніцы) зрабіў „ucztę“ асобна, а стшэльцам, памагаўшым ладзіць прадстаўленьне, — асобна. Якая была „uczta“ ў каморніка, мала каму ведама, бо адбывалася яна „przy drzwiach zamkniętych“, а стшэльцы так паўпіваліся, што ня толькі ня трымаліся прыказу пана каморніка, але і памяшалі „культурныя“ танцы з мужыцкімі, паразьбівалі адзін другому каламі галавы. Ну, а на заўтра „dochodzenie“ і пратакол „o zakłócenie spokoju“. Пасьля хлопцы цягнуцца ў Паставы, за 25 вёрст, дзе старoста павятовы пакараў іх на 50 зл. штрафу ці на тры тыдні арышту. Аб плаце ня можа быць гутаркі, бо усякі голы, як турэцкі сьвяты. І нашыя стшэльцы, пабраўшы торбачкі за плечы, папляліся за 60 вёрст у Сьвянцяны адбываць ў вастрозе кару. А каморнік тымчасам... збанкрутатаваў. Апрача таго, што сумленьне меў нячыстае ў адносінах да вёскі, нарабіў нечага нячыстага ў адносінах да свайго начальства, а за гэта атрымаў «адстаўку».

Голы.

Літары.

(Вясковыя абразкі з Беласточчыны).

Што-ж, здавалася, супольнага маюць літары з вясковымі абразкамі? Але факт фактам: цяпер цэлыя вёскі і гміны з напружаньнем сочаць за альфабэтам. Сёньня, прыкладам, у нас, каля Беластоку, такой пашанай карыстаецца літара „П“. Яна адным сваім гукам прыводзіць сэквэстратара, які настойліва дамагаецца заплаціць падаткі, залегласьці і працэнты...

Сёньня на парадку дня *толькі* „П“, гэта зн *толькі* тыя гаспадары, прозьвішча якіх пачынаецца на гэтую няшчасную літару, павінны плаціць, *толькі ў іх* за нявыплату, крутнуўшы хвастом, пакідае надворак карова. Пасьля такое „шчасьце“ сустрэне носьбітаў літары „Р“, „С“, „Т“ і г. д. аж да самага канца альфабэту, пакуль пачарзе і *ў розніцу* не перабяруць усіх сялян.

На тэму гэтае „літарнае сыстэмы“ шмат у сялянства гутарак. Закрануўшы набалелае пытаньне, гутаркі становяцца зазвычай узаемным і бясконцым абменам самых разнародных настрояў і думак ад роспачы і чаканьня вайны, якую немалая колькасьць насельніцтва лічыць выхадам з жыцьцёвага тупіка, да зусім здаровых надзей на заўтра, якое трэба здабыць.

Зусім зразумелым будзе гэтае напружанае думаньне шэрых сялянскіх гушчаў, калі мы прыслухаемся да ціхае і пераканаўчае гамонкі сялянскіх гаспадарак, якія прамовяць да нас моваю сухіх, але характэрных лічбаў, узятых з чатырох вёсах Харашчанскае гміны:

Гаспадарка — 1,75 га; сямʻя—4 душы.					
Прадукт	Сабрана ў пудах.	На пасеў.	Сабе.	На прадажу.	Даходу ў злот.
Жыта	30	6	24	—	—
Авёс	9	3	6	—	—
Ячмень	5	1,5	3,5	—	—
Пшаніца	—	—	—	—	—
Гарох	—	—	—	—	—
Бульба	250	50	200	—	—
Малако	—	—	—	—	15

Такая гаспадарка павінна заплаціць падатку разам з страхоўкаю — 23 зл., пакрыць залегласьці за 1933 г. — 23 зл.; выплаціць пазычку — 300 зл. або 36 зл. гадавых працэнтаў.

Падлічыўшы ўсё гэта выходзіць, што такая карлаватая гаспадарка змушана плаціць у год аж 60 зл., хоць на дзеле яна *няздольная нават пракарміць* гэтых 4 душ, ня кажучы ўжо аб вопратцы ды спажываньні *прамысловых прадуктаў.*

На пытаньне ці ўладар гэтага „маёнтку“ спажывае цукар, ён усьміхаючыся адказаў:

— Цукар!.. Каб мы яго спажываалі, то напэўна ня мелі-б ня толькі хлеба, але і самое „пані“ бульбы, якая нас пакуль што выручае з голаду.

— Вы пытаецеся пра цукар, — далучаецца да гутаркі другі — мы памаленьку выракаемся газы, сернічкаў і нават солі. Падумайце: каб купіць кілё цукру трэба прадаць 4 пуды бульбы або пуд жыта; літр газы каштуе 60 гр., за якія прадаецца $1^1/_2$ пуды бульбы. 4 скрынкі сернічкаў — адзін пуд бульбы. Вось тут і еш цукар!.. — закончыў селянін.

Ен такімі лічбамі намаляваў абразок даходнасьці свае гаспадаркі:

Гаспадарка — 8 га, сямʻя — 4 душы					
Прадукт.	Сабрана ў пудах.	На пасеў.	Сабе.	На прадажу.	Даход у злот.
Жыта	80	24	56	—	—
Авёс	7,5	4	3,5	—	—
Ячмень	12	2	10	—	—
Пшаніца	12	4	8	—	—
Гарох	20	2	8	10	20
Бульба	700	100	450	150	75
Малако	—	—	—	—	100
Яйкі	—	—	—	—	10
Разам продана на 205 зл.					

Такім чынам, гэты селянін мае — паводле свайго ўласнага падліку—205 зл. чыстага даходу. З гэтага падаткі і страхоўка за 1933—34 г.—70 зл., залегласьці — 210 зл. (на іх ужо нарастае 12%, або 25 зл. у год). Злажыўшы падаткі і працэнты (без пагашэньня залегласьцяў), атрымаем 95 зл. Калі дадамо сюды розныя *дробныя* „поборы“, дык гэты цяжар пераваліць за сотню залатовак, мінаючы падаткі *пасярэднія*, для вока сялянскага няпрыкметныя, але для гаспадаркі—руйнуючыя.

Селянін-бедняк адкрыта кажа, што плаціць ня будзе, бо няма з чаго. Сярэдні-ж гаспадарык усьцяж напружваў сілы, каб утрымацца, перацярпець, „моʻ палепшае“, але сёньня — махнуў рукою: не цяпер, дык у чацьвер, а ўсё роўна «літара» ня міне.

Прыводзім два прыклады такіх сярэдніх гаспадарак.

Першы тып:

Гаспадарка — 12 га, сям'я — 4 душы.					
Прадукт.	Сабрана ў пудах.	На пасеў.	Сабе.	На прадажу.	Даход у злот.
Жыта	210	24	76	110	220
Авёс	24	8	16	—	—
Ячмень	8	2	6	—	—
Пшаніца	20	5	15	—	—
Гарох	24	4	10	10	20
Бульба	800	80	470	250	125
Малако	—	—	—	—	20
Разам прадана на 385 зл.					

Бягучы падатак—77 зл., залеглыя ад 1929 г падаткі — 300 зл. і 330 зл. за камасацыю. Разам — 630 зл. (у год працэнты нарастаюць да 76 зл.). Падаткі і працэнты, ці — інакш кажучы — тое, што трэба плаціць зараз-жа, — складае суму ў 153 зл.

Тып другі выглядае так:

Гаспадарка — 11 га, сям'я — 7 душ.					
Прадукт.	Сабрана у пудах.	На пасеў.	Сабе.	На прадажу.	Даход у злот.
Жыта	162	24	100	38	76
Авёс	60	7	53	—	—
Ячмень	30	2	28	—	—
Пшаніца	—	—	—	—	—
Гарох	8	2	6	—	—
Бульба	910	125	535	250	125
Малако	—	—	—	—	150
Разам прадана на 351 зл.					

У год гэтая гаспадарка мае 51 зл. падатку, 93 зл.—за камасацыю і 120 зл. процэнтаў за пазычку, якой яшчэ асталося заплаціць... 2000 злот. Сума выдаткаў — 264 зл.

Калі да гэтых лічбаў не падходзіць гола, а браць іх у жыцьцёвым руху, тады кожнаму стане ясна, што ні бедны, ні сярэдні ніколі селянін сваіх даходаў не атрымліваў такою сумаю, якою паказаны яны ў нас. Даходы прыцякаюць у хату па грошу, па паўзалатоўцы і вельмі рэдка залатоўкамі; але ў сваю чаргу выцякаюць з сялянскае хаты на розныя жыцьцёвыя патрэбы, якіх ёсьць дзесяткі, зусім неабходных і далёкіх ад роскашы.

Заробкі па-за гаспадаркаю зьвяліся на нет. Свабодная работніцкая сіла, гібеючая людзкая энэргія — ляжаць адлогам, складаючы *сотні тысяч* безработных сялян — босых, голых, паўгалодных, культурна адсталых і прыбітых, а цяпер —у дадатку—закаваных у зімовую сьцюжу.

Так выглядае сапраўднасьць нашае вёскі.

Беласток, сьнежань 1933. **Юр. Б.**

Апошнія навіны.

Польшча

Прамова мін. Перацкага ў Сойме.

19 сьнежня ў Сойме, бюджэтная сэсія катора адбываецца, выступіў з вялікай прамоваю аб унутраннім становішчы Польшчы Міністар Перацкі.

„Справа грамадзкае бясьпекі ў такім разьмеры, як гэта бачым сёньня, ёсьць зьявішчам пасьляваенным, сусьветным, абапёртым у значнай меры на аснове эканамічнага крызісу. Існуе цэлы рад прычын, якія ў Польшчы справу бясьпекі спэцыяльна завастраюць. Не на апошнім месцы сярод прычын і нашае географічнае становішча.

Разумеецца, што з асаблівай энэргіяй прыходзіцца змагацца з рухам каторы ня толькі нарушае грамадзкі супакой, але і падрывае асновы дзяржавы. Маю на думцы ўсялякія процідзяржаўныя і дывэрсыйныя дзеяньні, якія і на далей будзем бязьлітасна душыць.

Бягучы год, цяжкі пад гаспадарчым кутом погляду, адзначыўся таксама шэрагам ад'емных зьявішчаў у галіне бясьпекі. Паліцыя нярaз прымушана была карыстацца аружжам.

У барацьбе з камунізмам — кажа далей Перацкі,—стасуем тыя самыя мэтады што і раней. Вялікую ўвагу зьвяртаў гэты рух сёлета на вёску".

На запытаньне некаторых паслоў, чаму паліцыя карыстаецца канфідэнцыйнымі мэтадамі, мін. Перацкі адказаў, што гэта робіцца з прычыны дзяржаўнае неабходнасьці. „Я сам карыстаўся-б канфідэнтамі, каб толькі гэтым шляхам мог папярэдзіць забойства Голубкі. Зьяўляюся чалавекам практычных дзяржаўных задач, ня шукаю рамантызму ў брутальных бакох сапраўднасьці".

Бюджэт міністэрства ўнутраных спраў на наступны год укладаецца ў суму 195.160.470 зл., з чаго 70,1% ідзе на выдаткі пэрсанальныя.

Эканамічны камітэт міністраў аб дапамозе галадаючаму насельніцтву „крэсаў".

Вялікі неўраджай, які сёлета наведаў Віленшчыну і іншыя ранёны Заходняе Беларусі сваімі разьмерамі можа раўняцца да рэкорднага неўраджаю 1928-29 году, калі галадалі ў Віленшчыне сотні тысяч сялян. Становішча настолькі сур'ёзнае, што справамі голаду на „Крэсах" спэцыяльна заняўся на сваім паседжаньні Эканамічны Камітэт міністраў. Пастанова камітэту *прадбачыць* перадачу часткі дзяржаўных збожавых запасаў Фундушу Працы для галадаючага вясковага насельніцтва „крэсаў", за атрыманую дапамогу, насельніцтва прымушана будзе *адпрацаваць.*

Безрабоцьце.

Паводле даных урадовае статыстыкі на 16 сьнежня было на ўсёй Польшчы 307,690 зарэгістрованых безработных. Упараўнаньні з папярэднім тыднем лічба гэтая вырасла на 24,639. З агульнае лічбы на Горны Шлёнск прыпадае 86.181.

Яшчэ адзін Кобрынскі працэс.

Пінскі Акружны суд разглядаў не сваёй выезднай сэс'і ў Кобрыне яшчэ адну справу, зьвязаную з нападам на пастарунак паліцыі у в. Новасёлкі.

На лаве падсудных засела 23 сялян. Прысуд суровы, бо чатырох з іх засуджана на 12 гадоў вастрогу, а чатырнаццаць—па 10. Двох падсудных атрымалі па аднаму году і двох суд апраўдаў. Усе падсудныя пазбаўлены грамадзкіх правоў.

Справа аднога сяляніна адложана з прычыны цяжкае хваробы, вылучана і будзе разглядацца асобна.

Заграніца

15-годзьдзе вызваленьня Савецкае Украіны з-пад нямецкае акупацыі.

16 сьнежня на ўсёй Савецкай Украіне адбылося ўрачыстае сьвяткаваньне пятнаццацігодзьдзя вызваленьня з-пад ярма нямецкае акупацыі. Украінская прэса на чале з харкаўскай газэтай „Камуніст" прысьвяціла пятнаццацігодзьдзю спэцыяльныя нумары. Шматлікія артыкулы, ілюстраваныя фатаграфіямі, даюць яскравы малюнак жудаснага тэрору і бязьлітаснага грабяжу прынесеных Украіне на штыкох арміяй нямецкага імперыялізму, а таксама адбіваюць гераічную барацьбу украінскіх работнікаў і сялян супроць акупанта. Пералічаюцца сялянскія паўстаньні, работніцкія забастоўкі ў прамысловасьці і на чыгунках. Пятнаццацігодзьдзю вызваленьня Савецкае Украіны з-пад нямецкае акупацыі прысьвячае артыкулы таксама прэса іншых савецкіх рэспублік. Маскоўскія „Известія" пішуць, што „гэтых угодкаў працоўны дюд Савецкае Украіны не забудзе ніколі тым болей цяпер, калі ў Нямеччыне паднімаюць головы недабітыя астаткі украінскай контррэвалюцыі, падтрымліваныя фашыстоўскімі дзеячамі".

6 паход Чанг-Кай-Шэка на Савецкі Кітай.

На перакор весткам буржуазных агенцтваў аб, нібы, разгроме кітайскай чырвонай арміі, чарговы — шосты паход Чанг-Кай-Шэка на чырвоныя правінцыі Кітаю правальваюцца, хоць Чанг-Кай-Шэка падтрымліваюць іншыя імпэрыялістычныя дзяржавы.

Савецкая прэса, пішучы аб новых перамогах кітайскае чырвонае арміі над белымі вайскамі Чанг-Кай-Шэка, між іншым паведамляе, што ў цяперашні час насельніцтва Савецкіх правінцый Кітаю дасягае 100 мільёнаў, а лік чырвонае арміі — 300.000 чалавек.

Ці ведаеш, што:

× 15 сьнежня здарылася чыгуначная катастрофа ў Пазнані. Загінула 8 асоб пераважна са школьнае моладзі. Цяжка параненых налічваецца 20 асоб.

× Каля Парыжа здарылася 23 сьнежня вечарам страшэнная чыгуначная катастрофа. Экспрэс з разгонам 100 кіл. на гадзіну наскочыў на другі цягнік. 217 асоб забітых і 300 параненых.

× У палове студня 1934 году пойдзе першы транспарт сукна і мануфактуры з Беластоку ў СССР. Гэты транспарт лічыць 20 вагонаў.

× За гэты год у Савецкай Беларусі лік перапрацоўваючых лён фабрык з 78 вырас да 125.

× Міністэрства чыгунак у Польшчы ад 1-га студня 1934 г. зьнізіла на 25% цэны білетаў за праезды далей чым 80 кіл. Цэны білетаў за бліжэйшыя праезды астаюцца на ранейшым роўні.

× У Італіі трывала 2 дні нябачаная там дагэтуль сьнежная замяць, якая нарабіла шмат шкоды.

× 15 сьнежня ў Маскве камісар Літвінаў і пасол Італіі абмяняліся дакумэнтамі ў справе дагавору аб узаемным ненападаньні.

× У Бастоне (Амэрыка) адбылася вялікая антыфашыстоўская дэманстрацыя перад нямецкім консулятам. Дэманстранты хацелі прарвацца ў памешканьне консуляту і разграміць яго, але толькі выбілі шыбы, бо паліцыя прыпусьціла штурм, разганяючы дэманстрацыю і арыштоўваючы 10 асоб.

× У Нямеччыне загранічны гандаль скараціўся з $2\frac{2}{3}$ мільёнаў да $1\frac{3}{4}$ мільёна.

× У Карэі (краіна пад японскай акупацыяй) гэтымі днямі закончыўся працэс 245 камуністаў, абвінавачаных за удзел у паўстаньні 1930 г. Суд асудзіў 22 камуністаў на сьмерць, 20 — на вечны вастрог, а рэшту — ад 15 гадоў да 1 году вастрогу.

× У оазісах пустыні Сахары выпаў сьнег. З даўных-давён ня памятаюць такога здарэньня.

× У цэлай Грэцыі забаставалі працаўнікі поштаў і тэлеграфаў. Забастоўку выклікала тое, што ўрад пастанавіў зьніжыць працаўнікам заробкі. Забастоўка праходзіць дружна і пад уплывам камуністаў. Сувязь паміж гарадамі і з заграніцай перарваная. Урад загадаў арыштаваць кіраўнікоў забастоўкі.

× Дзеячы польскіх апазыцыйных партый „Цэнтралеву", асуджаныя Найвышэйшым Судом на розныя дробныя тэрміны турмы і ўцёкшыя заграніцу, апублікавалі ў Празе Чэскай дэклярацыю з тлумачэньнем чаму выехалі за межы Польшчы і з пратэстам супроць прысуду над імі. Дэклярацыю падпісалі людоўцы Вітас, Багінскі і Кернік, а таксама пэпээсавец Лібэрман.

× „І. К. Ц." паведамляе аб эпідэміі тыфусу ў Клешаве на Валыні і ў Столінскім павеце на Палесьсі. Ёсьць памёршыя.

× Нямецкі міністр „справедлівасьці" ўнёс праект новага карнага кадэксу. Праект прадбачыць кары нават для чужаземцаў, якія зрабілі праступак супроць гітлерызму хоць-бы і па-за межамі Нямеччыны. Новы гітлероўткі кадэкс уводзіць фізычныя кары. Маюць быць заснованы спэцыяльныя курсы, якія будуць выпускаць кваліфікаваных катаў.

× Сын Торглера зьвярнуўся на старонках маскоўскай газэты „Камсамольская Праўда" з заклікам: „вырваць з лапаў нямецкага фашызму чатырох бальшавікоў".

Адказы рэдакцыі.

СЯЛЯНАМ вёсак НЯЗБОДЗІЧ і ЗАРЭЧАН. Пратэсты Вашыя атрымалі. Зьмяшчаем. Цешыць нас, што Вы сталі ў прыклад іншым вёскам Заходняе Беларусі, займаючы шэрагі перадавых і сьвядомых.

СЯЛЯНАМ в. КАРАЛЕВІЧЫ. Ліст атрымалі. За ўсё — і за ліст, і за пажаданьні, і за спачуваньне з прычыны „цяжкіх" сьлядоў — шчыра дзякуем Шлём Вам узаемна свой прывет і пажаданьні, каб вашыя „цьвёрдыя надзеі" ніколі Вас не пакідалі. Чакаем лістоў аб Вашам жыцьці. Пішэце, як у Вас з ураджаем.

В. ГАЙ. Ваш артыкул цэнны тым, што мае шмат жывых данных. Але з гэтых данных Вы робіце вывады неправільныя. Артыкул усё-ж выкарыстаем. Пішэце.

МУЖЫЧОК. Пастараемся з прысланага скарыстаць.

Ф. МІСЮЛЬ· Добра, што Вы пераканаліся ў здрадзе хадэкаў· Кепска толькі што даліся папу Яськаву ўцягнуць у шкурніцкую „барацьбу" з вуніятам Ружыцкім за прыходзкі дом. За „выкурэньне" з дому, абяцаў Вам Яськоў „танна вянчаць, хрысьціць і хаваць". На справе-ж нат гэтага ня выканаў, а „дзярэ", як усе яго „соратники". Сяляне павінны пераканацца, што ўсе спрэчкі паміж клерам праваслаўным, вуніяцкім ці каталіцкім ёсьць для нас чужымі і няпатрэбнымі, бо толькі адцягваюць увагу ад сапраўды важных пытаньняў сёньняшняга дня.

К. ШЭРЫ. Артыкул „Ліквідацыя руйнуючае спадчыны" хіба што ня пойдзе ў нашай газэце, бо лічым непатрэбным так шырака расьпісывацца аб асобах там закранутых, У артыкуле цэнна тое, што да пэўнае ступені падагулівае распачатую кампанію.

ВЛАДАК ПАКРЫУДЖАНЫ. Карэспандэнцыю атрымалі, Зьмесьцім у наступным нумары.

УСІМ, ХТО ПРЫСЛАЎ КАРЭСПАНДЭНЦЫІ АБ ВЫБАРАХ. Дзякуем за артыкулы. Выкарыстаць ня можам з прычын ад нас незалежных.

СЯБРА. Карэспандэнцыю аб закладзінах спажывецкага каапэратыву ў Жойдзішках атрымалі Выкарыстаем. Тое, што ў нашай барацьбе з хадэцкай „Крыніцай", ці як Вы пішаце „баст'ёнам" чорнае рэакцыі, паступовы элемэнт вёскі на нашым баку.—зразумела і радасна. Прывет!

АБСЭРВАТАРУ. Фэльетон аб піянцы „гарадзенскіх дзеячоў, як Бабровіча і Ко, ня пойдзе. Тэма не цікавая.

Матэр'ял аб кітайскіх падзеях выкарыстаем. Можа-б Вы нам сыстэматычна складалі Горадзенскую хроніку з работніцкага жыцьця· Вельмі будзем удзячны.

А. К—юк. Артыкул аб вучнёўскам працэсе пастараемся скарыстаць, таму што тэма канкрэтная. Разважаньня аб прычынах дэмаралізацыі— пустыя і ня цікавы я.

СЯЛЯНАМ В· КАЧКІ (Ваўкавышчына). Ваш ліст і сабраныя грошы ў колькасьці 3 зл. мы атрымалі. Газэту высылаем.

ЗАПОЛЬСКІ ЖЫХАР. Карэспандэнцыю атрымалі· Выкарыстаем.

Пашырайце „Беларускую Газэту".

Рэдактар-выдавец: інж. А. Карповіч.

Друкарня Я. Левіна Вільня, Нямецкая 22